# Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя

## на сучасным этапе

Рубеж XX і XXI стагоддзяў вызначаецца не толькі каляндарнай зменай эпох, але і далейшым развіццём навуковых ведаў, у тым ліку і ў бібліятэказнаўстве. Сярод прагрэсіўных змен у бібліятэчнай справе — мадэрнізацыя універсальных бібліятэчных класіфікацый – адна з найбольш складаных і цікавых праблем у тэорыі класіфікацыі.

Мадэрнізацыя любой універсальнай бібліятэчнай класіфікацыі ўяўляе сабой перапрацоўку класіфікацыйнай сістэмы ў адпаведнасці з развіццём ведаў аб свеце і чалавеку ў разнастайных яго формах. Менавіта ад карэктнасці прынятых рашэнняў залежыць аптымальнае функцыянаванне і далейшае развіццё класіфікацыйнай сістэмы.

Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя (ББК) – самая маладая з глыбока дэталізаваных класіфікацыйных сістэм. Яна прыметна адрозніваецца выключным багаццем катэгорый, магчымасцю камбінавання, альтэрнатывамі, метадычнымі прыёмамі, класіфікацыйнымі формуламі.

На сённяшні дзень актыўна адбываецца працэс мадэрнізацыі табліц ББК, які ажыццяўляецца шляхам адэкватнага адлюстравання сучаснай навукі і грамадскай практыкі. Навукова-даследчы цэнтр развіцця ББК (НДЦ ББК) Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (РДБ) выконвае функцыі федэральнага міжведамаснага арганізацыйнага і каардынуючага органа па ўсім коле праблем, звязаных з ББК. Усе змяненні і дапаўненні, якія адбываюцца ў ББК на сучасным этапе, выпускаюцца ў выглядзе Сярэдніх табліц, у якіх максімальна поўна адлюстраваны спектр пытанняў па гісторыі, геаграфіі і этнаграфіі, эканоміцы, культуры і мове, праву, ваеннай справе і іншых прадметных галінах, пашырана дэталізацыя, дапоўнены і ўдакладнены фармулёўкі тыпавых дзяленняў агульнага і спецыяльнага прымянення.

Бібліятэчная грамадскасць ужо пазнаёмілася з першым выпускам Сярэдніх табліц. Ён выйшаў у свет у 2001 г. і адкрывае цыкл сацыяльных (грамадскіх) навук. Гэты выпуск уключае аддзелы «60 Сацыяльныя навукі ў цэлым. Грамадствазнаўства» (раздзелы «60.0 Сацыяльная філасофія», «60.5 Сацыялогія», «60.6 Статыстыка», «60.7 Дэмаграфія», «60.8 Сацыяльнае ўпраўленне») і «63 Гісторыя. Гістарычныя навукі» (раздзелы «63.0 Тэарэтычныя асновы і метадалогія гістарычнай навукі», «63.1 Гісторыя гістарычнай навукі», «63.2 Крыніцазнаўства. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны», «63.3 Гісторыя», «63.4 Археалогія», «63.5 Этналогія»). Выданне мае метадычныя рэкамендацыі, табліцы спецыяльных тыпавых дзяленняў і разгорнуты алфавітна-прадметны паказальнік.

У маі 2006 г. выйшаў другі выпуск Сярэдніх табліц, які завяршае цыкл сацыяльных (грамадскіх) навук і ўключае наступныя аддзелы: «65 Эканоміка. Эканамічныя навукі», «66 Палітыка. Паліталогія», «67 Права. Юрыдычныя навукі», «68 Ваенная справа. Ваенная навука».

Выпуск пачынаецца аддзелам «65 Эканоміка. Эканамічныя навукі», які істотна мадэрнізаваны і прызначаны для сістэматызацыі літаратуры па эканамічных навуках і гаспадарчай практыцы. У аддзеле найбольш поўна прадстаўлена новая эканамічная праблематыка; у тыпавых табліцах выключаны дзяленні, якія не забяспечаны сучаснай літаратурай і не выкарыстоўваюцца ў практыцы сістэматызацыі.

У аддзел 65 унесены дапаўненні і змяненні; карэнным чынам перапрацаваны шэраг раздзелаў і падраздзелаў, уведзены новыя дзяленні, якія адлюстроўваюць актуальныя праблемы эканомікі, такія, як рынак, рынкавыя адносіны, пастаўшчыкі і пасрэднікі, рызыкі, лагістыка, маркетынг і інш. Значна пашыраны паняційны апарат, усе падраздзяленні аддзела 65 атрымалі новае напаўненне, што адпавядае сучаснаму стану гэтых галін ведаў.

Значна змяніліся структура, змест і індэксацыя аддзела «66 Палітыка. Паліталогія». Ён аптымізаваны з улікам развіцця паліталогіі, асэнсавання палітычных ведаў, падзей і з'яў, што адбыліся ў канцы XX – пачатку XXI ст. як у краіне, так і ў свеце.

Наступны аддзел «67 Права. Юрыдычныя навукі» адлюстроўвае сучасную сістэму юрыдычных ведаў і ахоплівае разнастайнае кола тэарэтычных, унутрыдзяржаўных і міжнародных пытанняў. У дадзеным аддзеле па-новаму асвятлены пытанні дзяржавы, правазнаўства, юрыспрудэнцыі і галін, што прымыкаюць да іх, сур'ёзна перагледжана групоўка галін права, з пазіцыі сённяшняга дня пададзена гісторыя палітычнай і прававой думкі.

Завяршае цыкл сацыяльных (грамадскіх) навук аддзел «68 Ваенная справа. Ваенная навука», актуалізацыя якога дазволіла прадставіць у абноўленым выглядзе сістэму сучасных ведаў аб ваеннай навуцы і ваеннай справе. З'явіліся новыя раздзелы «68.0 Ваенная навука ў цэлым» «68.1 Ваенная палітыка, ваенныя дактрыны», «68.2 Тэорыя ваеннага майстэрства», «68.3 Ваенна-гістарычная навука».

Вялікае значэнне для вызначэння правільнага класіфікацыйнага індэкса мае ўвядзенне Планаў раз-

мяшчэння для дэталізацыі індэксаў аддзела 66 і пашырэнне табліц спецыяльных тыпавых дзяленняў.

Неабходна падкрэсліць, што ў дадзеным выпуску важным з'яўляецца ўвядзенне адзінай табліцы тыпавых дзяленняў, што дапаможа сістэматызатарам пры дэталізацыі матэрыялу па сусветнай эканоміцы ў цэлым, сістэм краін, асобных краін і рэгіёнаў.

У адпаведнасці з рэаліямі сённяшняга часу другі выпуск перапрацаваны ў плане ўпадпарадкаванасці структуры, удакладнення фармулёвак класіфікацыйных дзяленняў. Больш лагічна прадстаўлены сувязі і размежаванні з іншымі аддзеламі класіфікацыі.

Акрамя таго, у гэтым выданні дапоўнены, апублікаваны аддзел «60 Сацыяльныя навукі ў цэлым. Грамадствазнаўства», а таксама ў выглядзе асобнага дадатка прыведзены папраўкі і ўдакладненні да першага выпуску Сярэдніх табліц ББК.

НДЦ ББК рыхтуе да выдання трэці выпуск Сярэдніх табліц, у якім будуць адлюстраваны пытанні сельскай і лясной гаспадаркі, сельскагаспадарчых і лесагаспадарчых навук, аховы здароўя, медыцынскіх навук. Яго выхад з друку запланаваны на канец 2007 г.

Неабходна адзначыць, што ББК працягвае заставацца асноўнай класіфікацыйнай сістэмай, па якой арганізаваны фонды і каталогі буйнейшых бібліятэчных сетак Рэспублікі Беларусь: Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, шэрагу ведамасных бібліятэк.

Спадзяёмся, што Сярэднія табліцы будуць своечасова набывацца ў адпаведнасці з выхадам у свет чарговых выпускаў і служыць неабходным інструментам у рабоце бібліятэчных спецыялістаў, што, безумоўна, дазволіць ім унесці адпаведныя змяненні ў арганізацыю фондаў бібліятэк, правесці паэтапнае рэдагаванне каталогаў, удасканаліць даведачна-пошукавы апарат. У выніку гэта будзе садзейнічаць максімальна якаснаму задавальненню інфармацыйных патрэб карыстальнікаў на сучасным узроўні.

***А. Андронава,***
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*